*Поздравляем!*

## Хто працуе, той не сумуе!

**Міхась Даніленка — беларускі празаік, аўтар шматлікіх кніг прозы. Многія ягоныя дзіцячыя творы змешчаны ў падручніках, дапаможніках для пазакласнага чытання. Але мала хто ведае, што пісьменнік жыве ў Савецкім раёне Гомеля.**

…У калідоры ўтульнай двухпакаёўкі, на самым відным месцы, вісяць звычайныя вясковыя лапці, ёсць і самапрадка. Старадаўнія атрыбуты быццам нагадваюць: усе мы родам з вёскі … Міхась Пятровіч нарадзіўся ў простай сялянскай сям'і, у вёсцы Ястрабка Лоеўскага раёна. Старанна вучыўся ў Баршчоўскай сямігодцы, занатоўваў веды, якія потым дапамаглі паступіць ў Рэчыцкае педагагічнае вучылішча.

Менавіта ў той час нарадзіліся першыя літаратурныя практыкаванні. Спачатку юны Міхась пісаў для сябе ў сшытак, потым даслаў свой твор у абласную газету «Бальшавік Палесся». Калі яго надрукавалі, свае «патаемныя думкі» накіраваў ужо ў Мінск, у «Літаратуру і мастацтва», іншыя выданні.

Пасля вайны Даніленка настаўнічаў у вёсцы Казярогі. Але прыцягальнай была літаратурная праца, якая стала сэнсам жыцця. Доўгі час Міхась Пятровіч рабіў у абласной газеце «Гомельская праўда», атрымаў ганаровае званне «Выдатнік друку». Да ваенных узнагарод далучыліся медаль «За працоўную адзнаку», Ганаровыя граматы Вярхоўнага Савета БССР. Шмат каму з мясцовых пісьменнікаў ён указаў правільны шлях у літаратуру, нават даў станоўчыя рэкамендацыі для паступлення ў Саюз пісьменнікаў. Першая кніжка прозы « Мая песня» пабачыла свет у далёкім 1952 годзе, потым з'явіліся іншыя. На рахунку празаіка каля дваццаці цікавых кніжак для дзяцей і дарослых.

Нягледзячы на паважаны ўзрост, Міхась Пятровіч па-ранейшаму друкуецца ў розных выданнях. Рэспубліканскі дзіцячы фонд у сувязі з пяцідзесяцігоддзем дзіцячага часопіса «Вясёлка» узнагародзіў сёлета свайго пазаштатнага аўтара Ганаровай граматай за актыўнасць і плён. 28 кастрычніка Міхасю Пятровічу споўнілася 85 гадоў. Віншуем! І жадаем здароўя, бадзёрасці, натхнення, новых твораў.

